Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа № 25 г. Гомеля імя Б.А.Царыкава”

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ
# “ВЫКАРЫСТАННЕ ГУЛЬНЁВАЙ ТЭХНАЛОГІІ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ПАЗНАВАЛЬНАЙ АКТЫЎНАСЦІ ВУЧНЯЎ”

Зэкава Маргарыта Аляксандраўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
8(044)7194687;
e-mail: zekova_rita@mail.ru

## *1. Інфармацыйны блок*

### 1.1. Назва тэмы вопыту

Выкарыстанне гульнёвай тэхналогіі на ўроках беларускай мовы як сродак развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

### 1.2. Актуальнасць вопыту

Праблема актыўнасці навучэнца ў вучобе адна з важных у сучасным адукацыйным працэсе. Сёння вялікае значэнне набывае пошук эфектыўных шляхоў навучання, павышэнне якасці засваення ведаў у школе, выяўленне ўнутраных рэзерваў пазнавальнай актыўнасці, разумовых працэсаў і памяці вучняў. Адукацыйны працэс будуецца на разуменні таго, што вучэнне адбываецца не тады, калі вучань запамінае тыя або іншыя факты, а калі ўсвядоміць, якія разумовыя сродкі ён выкарыстае ў працэсе вучэння [1, с.18]. Часта заўважаеш, што школьнікі не жадаюць і не любяць вучыцца, не праяўляюць цікавасці да навучальнага матэрыялу. Нізкая матывацыя вучняў прыводзіць да таго, што ім сумна на ўроку.

На мой погляд, трэба зрабіць працэс набыцця ведаў запамінальным, даць магчымасць вучням рабіць самастойныя вывады, бо ад актыўнасці дзіця на ўроку шмат у чым залежыць паспяховае авалоданне ім патрэбнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, таму ў сваёй педагагічнай дзейнасці я аддала перавагу гульнёвай тэхналогіі як сродку развіцця пазнавальнай актыўнасці.

Сучасныя псіхолагі адзначаюць, што інтэлектуальная актыўнасць дзіця ў цэлым залежыць ад цікавасці, бо менавіта яна ўплывае на накіраванасць увагі і думкі. Я лічу, што пазнанне пачынаецца з цікавасці, а дзейнасць – з гульні.

Чым цікавей працэс гульні, тым вышэй цікавасць да яе зместу і выніку. Гатовых ведаў няма, іх можна атрымаць у гульнёвай сітуацыі: стварыць пастку для пазнавальнай цікавасці вучняў, у якой ім захочацца асвойваць навучальныя веды [4, с.47].

Гульня з’яўляецца своеасаблівым сродкам пабудовы мадэлі навакольнага свету. Менавіта ў гульні дзіця дасягае максімальна магчымай ступені самакіравання, яна спрыяе фарміраванню і развіццю маўленчых і камунікатыўных навыкаў, увагі, памяці, уяўленню, усіх пазнавальных працэсаў [5, с.34].

Гульнёвыя тэхналогіі маюць вялізны патэнцыял. Феномен гульні заключаецца ў тым, што, з’яўляючыся забавай, адпачынкам, яна адначасова можа быць і творчасцю, і навучаннем [2, с.66].

Уключаны ў гульню вучань часам і не падазравае, якімі рознабаковымі здольнасцямі і магчымасцямі ён валодае. У гульнях вучань можа выканаць ролю, якую ў сапраўдным жыцці ніколі на сябе і не ўзяў бы, у вызначаным сюжэце, па вызначаных правілах і ў канчатковым выніку можа атрымаць практычны вопыт, засвоіць веды, зрабіць выснову. У гульні ёсць вольная дзейнасць, ад яе вучань атрымлівае задавальненне, у яго раскрываецца творчы патэнцыял, з'яўляецца эмацыянальная афарбоўка дзейнасці, а наяўнасць правіл дае магчымасць лагічнай і часовай паслядоўнасці развіцця.

**1.3. Мэта вопыту**

Развіццё пазнавальнай актыўнасці вучняў праз выкарыстанне гульнёвай тэхналогіі на ўроках беларускай мовы.

**1.4. Задачы вопыту**

1) азнаёміцца з перадавым вопытам педагогаў па дадзенай тэме;
2) раскрыць ролю гульнёвай тэхналогіі, адабраць і апрабіраваць гульні, якія дапамогуць развіваць пазнавальную актыўнасць вучняў;
3) вызначыць эфектыўнасць выкарыстання гульнёвай тэхналогіі на ўроках беларускай мовы як сродка развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў;
4) выявіць перспектывы развіцця вопыту.

**1.5. Працягласць работы над вопытам**

Работа па дадзенай тэме паэтапна вялася мной больш за 4 гады.

Этапы работы:

I этап – прааналізаваны змест метадычнай літаратуры па выбранай праблеме, вывучаны рэкамендацыі;

II этап – зроблены адбор гульняў, рапрацавана і апрабіравана сістэма работы;

III этап – праведзены параўнальны аналіз узроўню навучання, дынаміка матывацыі навучальнай дзейнасці, зроблены вывады, улічаны недахопы, напісаны рэкамендацыі.

### *2. Апісанне тэхналогіі вопыту*

**2.1. Вядучая ідэя вопыту:** выкарыстанне гульнёвай тэхналогіі на ўроках беларускай мовы дазваляе актывізаваць пазнавальную актыўнасць вучняў і дасягнуць больш высокіх вынікаў у навучанні.

**2.2. Апісанне сутнасці вопыту**

Яшчэ ў XVII стагоддзі Ян Каменскі ў "Вялікай дыдактыцы" адзначаў, што правільна вучыць моладзь – гэта не значыць убіваць у галовы сабраную з аўтараў сумесь слоў, выразаў, думак, а гэта значыць – раскрываць здольнасць разумець рэчы, каб менавіта з гэтай здольнасці, быццам з жывой крыніцы, пацяклі веды.

Я ўпэўнена, што калі вучні актыўна ўдзельнічаюць у навучальным працэсе, павышаецца іх здольнасць да развaжання і разумення, таму на ўроках беларускай мовы я актыўна звяртаюся да гульнёвай тэхналогіі і выкарыстоўваю яе элементы на розных этапах заняткаў. Мае першыя спробы ў яе выкарыстанні пачаліся з прымянення лінгвістычных гульняў А.В.Солахава на асобных уроках мовы ў 5 класе, у асноўным на дыягнастычна-карэкцыйным этапе. Праз пэўны час я заўважыла, што гэты этап урока праходзіць больш эмацыянальна, у вучняў знікла скаванасць, страх перад адказам, і нават слаба матываваныя вучні актыўна ўключаліся ў вучэбны працэс. Гэта падштурхнула мяне да далейшых эксперыментаў: уключаць гульні ў розныя этапы ўрокаў, а пазней – абудзіць цікавасць не толькі пры прымяненні гатовых гульняў вучнямі, а і самім вучням,

пры жаданні, складаць, падбіраць матэрыял і прэзентаваць свае “прадукты”. Гэта дзейнасць вельмі падабаецца вучням.

Адпаведныя гульні выкарыстоўваю пры вывучэнні раздзелаў лінгвістыкі:

- ✓ *фанетычныя (“Ланцужок слоў”, “Елачка”, “Рэха”*; гульню *“Ланцужок слоў”* праводжу ў парах: адзін з вучняў называе слова з літарай, якая абазначае зычны гук і патрабуе праверкі пры напісанні, другі падбірае праверачныя словы: *касьба — касіць, скасіць* і інш.. Потым вучні мяняюцца ролямі. Перамагае той, хто назаве больш праверачных слоў.);
- ✓ *лексіка-фразеалагічныя* (гульні на значэнне слоў (*крыжаванкі, сканворды, загадкі*: у маленькім гаршчочку смачная каша, ды зачэрпнуць цяжка (арэх); круглае, як сонца, гарыць пад ім донца, зарумянены бачок — шух на ручнічок (блін)));
- ✓ *гульні на сістэмныя адносіны ў лексіцы: "прапорцыі", "трэці (чацвёрты, пяты) лішні", "асацыяцыі", "гібрыды", лато*. (Адзнач *“чацвёртае лішняе”:* праснак, жур, гладыш, крупнік);
- ✓ *гульні на развіццё навыкаў вуснага маналагічнага і дыялагічнага маўлення, пашырэнне слоўнікавага запасу: “Шукай сваю палову", “Знайдзі слова", “Складзі прыказку“, ”Збяры фразеалагізм”*; для правядзення гульні *“Збяры фразеалагізм”* загадзя фразеалагізмы разбіваю на дзве часткі (у свінныя, галасы; за трыдзевяць, зямель; бібікі, біць; за дзедам, шведам; ахілесава, пята), а вучням прапаную сабраць моўныя залацінкі ў адно цэлае);
- ✓ *гульні па марфеміцы і словаўтварэнню (“Чыё гняздо большае?”, “Рэшата”*: “прасейце“ дзеясловы (перабегчы, перабудаваць, перавезці, перагнуць, перагрэць, перадзяліць, перадрукаваць, пераесці, пераехаць, перайсці, перакіснуць, пераклеіць, перакроіць, пералезці, перапаўзці, перасаліць, перасеяць, пераспець) з прыстаўкай *пера-,* якая абазначае: а) 'накіраваць дзеянне з аднаго месца ў другое цераз прадмет або прастору', б) 'паўторна, па-новаму ажыццявіць дзеянне', в) 'давесці дзеянне да празмернасці');

✓ *марфалагічныя (“Сакаліны зрок”, “Шукаем словы”;* пры правядзенні гульні *“Шукаем назоўнік”* прапаную вучням выпісаць назоўнікі або з прапанаванага друкаванага тэксту, або з тэксту, які чытаю);

✓ *арфаграфічныя (“Арфаграфічнае лато”, “Арфаграфічная эстафета”, “Знайдзі пазл”, “Знайдзі лішняе”*; для правядзення гульні *“Знайдзі пазл”* слоўнікавыя словы, у якіх літары ў аднолькавых складах знаходзяцца ў слабай пазіцыі, разразаю на часткі, кожнаму ўдзельніку выдаю разрэзаныя часткі слоў (5-10 слоў), і ўдзельнікам патрэбна хутка і правільна скласці гэтыя словы);

✓ *сінтаксічныя гульні (“Карэктар”, “Хто хутчэй?”, “Шыфравальшчыкі”*; у час правядзення гульні *“Шыфравальшчыкі”* чытаю сказы, а вучні запісваюць іх, выкарыстоўваючы ўмоўныя абазначэнні: а ці А – словы аўтара, П – простая мова. “Як здорава вы прыдумалі!” – пахваліла матуля. Запіс выглядае так: “П!”-а.).

Гуляць звычайна хочацца ўсім вучням, важна толькі ўлічыць іх узроставыя асаблівасці, правільна выбраць форму гульні і арганічна ўключыць яе ў структуру пэўнага ўрока.

На матывацыйна-арганізацыйным этапе актывізую ў сваіх выхаванцаў апорныя веды да будучай тэмы ўрока. Напрыклад, перад тлумачэннем тэмы “Правапіс НЕ (НЯ) з прыметнікамі” ў шостым класе на дошцы загадзя запісваю словы, словазлучэнні і сказы па раней вывучаных тэмах і праводжу “Арфаграфічную хвілінку”: прапаную вучням згрупіраваць словы суадносна з правілам (“Правапіс НЕ (НЯ), НІ з назоўнікам”, “Правапіс НЕ (НЯ), НІ з дзеясловам”), знайсці арфаграмы і вызначыць, што агульнага ў правапісе НЕ (НЯ), НІ з указанымі часцінамі мовы (запіс на дошцы можа выглядаць так: *н…барака, н…вольнік, н…пагадзь, н…шчасце, н…ведаў, н…навідзець, н…дамагаць; н… даспявалі песні, н… даехаў да горада. Гусь свінне н… таварыш. Н… хлебам адзіным жыве чалавек*). Працэс набыцця ведаў ідзе актыўна, цікава, і таму новая інфармацыя запамінаецца лёгка.

У 5 класе для замацавання тэмы на правапіс слоў са з'явамі аглушэння і азванчэння прапаную гульню “Ланцужок слоў”, якая праводзіцца ў парах. Умова: адзін з вучняў называе слова з літарай, якая абазначае зычны гук і патрабуе праверкі пры напісанні, другі падбірае праверачныя словы. Напрыклад: *горад* - *гарады,* *у горадзе* і інш.. Потым вучні мяняюцца ролямі. Элемент спаборніцтва робіць дзейнасць вучняў актыўнай.

Пры адпрацоўцы навыкаў класіфікацыі зычных у 5 класе па тэме “Зычныя гукі” праводжу гульню “Рэха”: дзеці за партамі паварочваюцца тварамі адзін да аднаго. Умова: адзін вучань гучна вымаўляе звонкі зычны, а другі, як рэха, паўтарае яму парны глухі зычны. Калі называецца звонкі няпарны зычны, вядучы паказвае на гэта, а вучань выбывае з гульні. Перамагаюць тыя вучні, якія ў пары правільна назвалі зычныя.

Пры вывучэнні тэмы “Сінонімы” выкарыстоўваю гульню “Эстафета”, якая дапамагае пашырыць слоўнікавы запас вучняў: запісваю на дошцы словы ў 3 слупкі, прадстаўнікі трох каманд, перадаючы адзін аднаму крэйду, павінны дапісаць насупраць гэтых слоў па аднаму сіноніму. Перамагае каманда, якая хутчэй і без памылак выканае заданне.

Арфаграфічныя гульні будуць карыснымі на любым уроку. Адна з любімых вучнямі гульняў – *“Арфаграфічнае лато”*. Яно садзейнічае адпрацоўцы правапісу слоў, якія ўтрымліваюць у сабе беларускамоўныя з'явы: (аканне, яканне, дзеканне, цеканне). Рыхтую прыклад карткі са словамі, у якіх прапушчаныя літары ў слабых пазіцыях (л..генда, ча..вёрты, мядзве..ь, з..л..наваты, ва..янік, р..чны, кр..вавы, пам..ць, Прып..ць, зел..ніна, мун..ір). Патрэбны набор літар (О, Э, А, Ы, Е, Ё, Я, ДЗ, Д, Т, Ц) раздаю ўдзельнікам гульні. Кожнае слова мае свой нумар. Дастаю нумар, а ўдзельнікі гульні закрываюць літарамі прапушчаныя месцы. Перамагае той, хто першы правільна закрыў усе пропускі.

Вельмі падабаюцца вучням 5-ых класаў сюжэтныя гульні. Я выкарыстоўваю прыём прысутнасці на ўроках казачных герояў ці прыдуманых асоб, якія

прыходзяць на ўрок з заданнямі для вучняў. Так пры вывучэнні тэмы “Правапіс у, ў” на ўрок да пяцікласнікаў прыйшлі літары У і Ў. Яны расказалі пра сябе, пра свае адметнасці, пра ўмовы іх напісання, паказалі фотаздымкі, дзе знаходзіцца помнік літары ў.

Пры замацаванні тэмы “Правапіс у, ў” на ўрок у 5-ым класе зноў завіталі літары У і Ў. Яны прапанавалі вучням заданні, звязаныя з правапісам у, ў. Вучні з задавальненнем складалі прыклады, шукалі памылкі ў прапанаваных словах і словазлучэннях, падлічвалі колькасць наўмысна дапушчаных “гасцямі” памылак.

**2.3. Выніковасць і эфектыўнасць вопыту**

У працэсе работы можна адзначыць такія становучыя моманты: устойлівая пазнавальная цікавасць вучняў да прадмета, станоўчая дынаміка ўзроўню навучання, якасная дынаміка матывацыі навучальнай дзейнасці.

Дынаміка ўзроўню засваення навучальнага матэрыялу на прыкладзе 8 класа (2020/2021 навучальны год) пададзена ў табліцы.

**Табліца №1.**

| Узровень засваення | 2017/2018<br>5 клас | 2018/2019<br>6 клас | 2019/2020<br>7 клас | 2020/2021<br>8 клас |
|---|---|---|---|---|
| | 28 вучняў у класе | 26 вучняў у класе | 26 вучняў у класе | 25 вучняў у класе |
| Нізкі | - | - | - | - |
| Здавальняючы | 13 | 7 | 5 | 3 |
| Сярэдні | 8 | 10 | 9 | 9 |
| Дастатковы | 6 | 7 | 9 | 10 |
| Высокі | 1 | 2 | 3 | 3 |

Пра выніковасць вопыту сведчаць і дасягненні вучняў. Мае вучні актыўна і паспяхова прымаюць удзел у інтэлектуальным рэспубліканскім конкурсе «Буслік» (2 вучні атрымалі дыплом I ст., 7 вучняў – дыплом II ст., 13 вучняў – дыплом III, 12 вучняў сталі прызёрамі), алімпіядзе па беларускай мове і

літаратуры (на II этапе рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры ў 2018 годзе вучаніца атрымала дыплом III ступені, на II этапе рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры ў 2019 годзе – дыплом III ступені, на II этапе рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры ў 2020 годзе – дыплом III ступені), віктарынах, конкурсах. Пры ўдзеле ў рэспубліканскім конкурсе “Выратавальнікі вачыма дзяцей”, які праводзіць МНС, на раённым этапе атрымалі 5 дыпломаў I ступені, 5 дыпломаў II ступені, 6 дыпломаў III ступені, на гарадскім этап – 2 дыпломы I ступені, 2 дыпломы II ступені, 1 дыплом III ступені, на абласным этапе – дыплом I ступені, на раённым этапе рэспубліканскага інтэрнэт-конкурса літаратурных работ “Зямля пад белымі крыламі” – дыплом I ступені., на раённым этапе рэспубліканскага конкурса “Вялікая Перамога” – 1 дыплом I ступені, 1 дыплом II ступені., 1 дыплом III ступені.

### *3. Заключэнне*

Зрабіць урок цікавым, а не забаўляльным, эфектыўным, а не эфектным, вучыць гуляючы, а не проста гуляць – такія галоўныя праблемы я вырашаю пры выкарыстанні гульнёвай тэхналогіі на ўроках беларускай мовы.

Аналізуючы вынікі праведзенай работы, можна зрабіць наступныя вывады:

1. выкарыстанне гульнёвай тэхналогіі дае магчымасць павысіць узровень матывацыі і пазнавальнай актыўнасці вучняў да вывучэння прадмета, дапамагае стварыць максімальна спрыяльныя ўмовы для адукацыйнага працэсу;
2. выкарыстанне гульнёвай тэхналогіі прадугледжвае кіраванне пазнавальнай дзейнасцю вучняў, развіццё ў іх уменняў самастойнай працы, самакантролю, ініцыятывы;
3. навучанне з ужываннем гульні развівае памяць, лагічнае мысленне, здольнасць да аналізу, параўнання, раскрываецца творчы патэнцыял, індывідуальныя здольнасці вучняў;
4. гульнёвая тэхналогія дае магчымасць найбольш рацыянальна арганізаваць калектыўную, парную і індывідуальную работу на ўроку (на

любым этапе ўрока), паспяхова арганізаваць паўтарэнне вывучанага, абагульненне і сістэматызацыю ведаў, садзейнічае развіццю моўнай культуры вучняў, павышэнню цікавасці да прадмета.

Матэрыялы прадстаўленага вопыту разглядаліся пры правядзенні ў 2017 годзе майстар-класа “Гульнёвая тэхналогія: ад тэорыі да практыкі” на гарадскім семінары “Сучасныя падыходы да выкладання беларускай мовы і літаратуры” для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры г.Гомеля, 21.02.2018 пры правядзенні адкрытага ўрока па тэме “Правапіс у-ў” для настаўнікаў школы, пры правядзенні пазакласных мерапрыемстваў (22.02.2018 – гульня-віктарына “Чароўны куфэрак”, 22.02.2019 – гульня-віктарына “Беларуская скарбонка”), 22.03.2018 на метадычным практыкуме для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры вобласці падчас правядзення павышэння кваліфікацыі, 05.11.2020 на пасяджэнні метадычнага аб’яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры школы, 06.11.2020 на педагагічнай нарадзе ў школе.

Атрымаўшы станоўчы вопыт выкарыстання гульняў на ўроках беларускай мовы, спрабую такія ж урокі праводзіць і па беларускай літаратуры. Лічу неабходным перанесці вопыт работы па выкарыстанні гульнёвай тэхналогіі на ўрокі беларускай літаратуры, папаўняць сваю капілку новымі напрацоўкамі.

## Спіс літаратуры

1. Запрудский, Н.И. Современные школьные технологии-2 / И.В.Запрудский. – Минск: Сэр-Вит, 2012. – 251 с.

2. Кандакова, Т.Р. Вучыцца трэба з захапленнем / Т.Р.Кандакова // Народная асвета. – 2014. – № 6. – С. 66-69.

3. Солахаў, А.В. Займальны матэрыял па беларускай мове: дапам. для настаўнікаў / А.В.Солахаў. – Мінск: ТАА "Лексіс", 2004. – 176 с.

4. Хозяшева, И. Ловушка для интереса / И.Хозяшева // Образование Минщины. – 2019. – № 3. – С.46-48.

5. Шаламіцкая, Н.М. Якасць адукацыі: актывізацыя і стымуляванне матываў вучэння / Н.М. Шаламіцкая // Народная асвета. – 2014. – № 10. – С. 33-39.

Дадатак 1

Урок беларускай мовы ў 5 класе

**Тэма: Правапіс у, ў**

**Мэта:** стварэнне ўмоў для засваення ведаў, уменняў і навыкаў па тэме "Правапіс у, ў".

**Задачы:** дапамагчы вучням засвоіць правіла напісання у, ў; удасканальваць навыкі вымаўлення і засваення правапісу у, ў у спрадвечна беларускіх словах і словах іншамоўнага паходжання; фарміраваць арфаграфічныя нормы беларускай мовы (правапіс у, ў); узбагачаць слоўнікавы запас вучняў; развіваць пазнавальную актыўнасць вучняў, мысленне, памяць і творчыя здольнасці вучняў; выхоўваць цікавасць да беларускай мовы.

**Тып урока:** урок паведамлення новых ведаў і фарміравання навыкаў і ўменняў.

**Абсталяванне:** падручнік, карткі-заданні, мультымедыйная прэзентацыя.

## Ход урока

*I. Матывацыйна-арганізацыйны этап.*

Слова настаўніка:

Вось ужо звінеў званок,
Запрасіў нас на ўрок.
Добры дзень, я вас вітаю,
Да заняткаў запрашаю.
Хай занятак будзе плённым,
І цікавым, і натхнёным.
Поспехаў я вам жадаю,
Калі што – я паспрыяю.

Праверка дамашняга задання: *гульня "Веру – не веру"* (вусна)

1. У беларускай мове гук [д] пры змякчэнні змяняецца на [дз']?

2. У беларускай мове гук [т] пры змякчэнні змяняецца на [дз']?
3. Дзеканнем называецца змяненне гука [д] пры яго змякчэнні на гук [т'] ?
4. Цеканнем называецца змяненне гука [т] пры яго змякчэнні на гук [ц'] ?
5. Пасля [дз'] пішуцца літары а, о, э, у ?
6. Пасля [ц'] пішуцца літары е, ё, ю, я, і ?

*Прытча пра ляноту*

Багаты чалавек збіраўся ў далёкае падарожжа. Каб аддзячыць людзям, якія служылі яму старанна і плённа, ён кожнаму выдаў пэўную колькасць грошай. Аднаму даў пяць срэбраных рублёў, другому – тры, трэцяму – адзін. Праз некаторы час ён вярнуўся з падарожжа і пацікавіўся, як жа яны патрацілі свае грошы. "Дзякуючы пяці рублям я зарабіў яшчэ столькі", – адказаў першы. Другі сціпла паказаў двойчы заробленыя грошы. А трэці моўчкі сціскаў усё той жа рубель: "Я думаў, што гэтыя грошы трэба будзе вярнуць табе назад, гаспадар, таму я нічога не зрабіў з імі." Багацей раззлаваўся і вымавіў: "Я даў табе шанс стаць багатым, але ты яго не скарыстаў. Калі я пакіну табе гэты рубель, ён будзе без патрэбы ляжаць у цябе, а ты так і будзеш без грошай. Таму я забяру яго ў цябе. Кожнаму, хто сумленна працуе, заўсёды прыбавіцца і далучыцца. А ў гультая і таго не стане".

Слова настаўніка: Я спадзяюся, што пасля сённяшняга ўрока па тэме "Правапіс у, ў" усе мы станем багатымі, бо выкарыстаем дадзены шанс: засвоім правіла напісання у, ў у спрадвечна беларускіх словах і словах іншамоўнага паходжання.

У нескладовае – літара адмысловая,

А хто яе не ведае, той з двойкай дадому бегае.

*II. Пазнавальна-аперацыйны этап.*

*Гульня "Карэктар"* (дазваляе развіваць арфаграфічную пільнасць і пісьменнаць, развіваць уважлівасць у працэсе пошуку памылак): у прапанаваных словах неабходна выправіць памылкі, калі яны ёсць: гомель, день, здароу'е, мышь, абява, казьба, дуп, ледзь, ня чуў, лягенда, біалогія, трыя, крававы, салаўі, ўвага, канцэлярыя, почарк, песенка, раскашчык, каменчык, дзьве.

Вучням прапануецца звярнуць увагу на тыя словы, у якіх напісалі у ці ў**,** і растлумачыць гэту арфаграму.

Слова настаўніка. Так, малайцы, некалькі выпадкаў напісання у, ў мы ўспомнілі паспяхова, але ж гэта не ўсё, таму я прапаную адправіцца ў казку, якая дазволіць нам пашырыць веды пра у, ў.

*"Чытанне з прыпынкамі"* (*інсцэніроўка* з удзелам аўтара (настаўнік), які "чытае", і *герояў* **(**Літара У і Літара Ў)).

Казка

У казачнай краіне галосных жыла Літара *У*, а ў суседняй краіне, краіне зычных, жыла-была Літара *Ў*. Жылі яны сабе, жылі, добрасумленна працавалі. Ведалі адна пра адну. Ім казалі, што яны знешне вельмі падобныя. І вось аднойчы…*(Вучні прапаноўваюць свае варыянты працягу казкі).* Аднойчы літары сустрэліся, каб пазнаёміцца, пагутарыць, расказаць пра сябе. Сустрэўшыся, доўга разглядвалі адна адну, а потым… *(Вучні прапаноўваюць свае варыянты працягу).* Яны ўбачылі, што сапраўды вельмі падобныя, але лёс у кожнай свой, у кожнай сваё жыццё, свая праца, свае абавязкі. У складовае рашыла расказаць пра сябе…*(Вучні прапаноўваюць свае варыянты).*

Стук у дзверы. *Уваходзяць гераіні казкі.*

*У складовае* (вучаніца ў ролі літары) расказвае: "Добры дзень, хлопчыкі і дзяўчынкі. Ці пазналі вы мяне? Малайцы. Так, я *У*. Што вы пра мяне ведаеце? *(вучні расказваюць)* Многа ўжо я чула ад вас пра сябе. Хачу штосьці нагадаць

іпадвесці вынік: я  абазначаю галосны гук, а значыць, утвараю склад, таму і завуць мяне “у складовае”, пішуць мяне ў пачатку сказаў, пасля знакаў прыпынку і пасля зычных, у пачатку ўласных назваў, у некаторых запазычаных словах. Звярніце ўвагу на табліцу-падказку, дзе адлюстравана дадзенае правіла”.

| |
|---|
| Літару у (у складовае) пішам |
| У пачатку сказа: *У лесе было ціха.* |
| Пасля знакаў прыпынку: *школа, у якой вучуся* |
| Пасля зычных: *луг* |
| У пачатку ўласных назваў: *на Урале* |
| У запазычаных словах, якія заканчваюцца на *-ум, -ус: радыус, страус* |
| У словах з націскным *у: аул, баул* |
| На канцы запазычаных слоў не пад націскам: *фрау, ток-шоу* |

А потым ў нескладовае (вучаніца ў ролі літары) таксама расказвае пра сваё жыццё, пра сваю працу (Малайцы, мне прыемна, што вы многае  ведаеце, але я хачу абагульніць тое, што было сказана і пра мяне: паглядзіце, ці падобна я знешне на *у складовае?* Не!!! Я перадаюся праз зычны гук, склад не ўтвараю, пішуць мяне пасля галосных, калі чаргуюся з гукамі [л], [в] або пасля злучка, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны ці пасля двукосся, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны. Звярніце ўвагу на табліцу-падказку, дзе адлюстравана гэта правіла).

| |
|---|
| *Літару ў (ў нескладовае) пішам* |
| Пасля галосных у пачатку слова: *сонца ўзышло* |
| У сярэдзіне слова пасля галосных перад зычнымі: *паўза, саўна, фаўна* |
| Пры чаргаванні [л] з  [ў]: *чытаў, думаў; але:палка, памылка, Алжыр* |
| Пры чаргаванні [в] з  [ў]: *лава – лаўка, крыві – кроў*; але: *ва В’етнаме, на рацэ Влтава* |

| | |
|---|---|
| Пасля злучка, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны: *хлопцы-ўмельцы* | |
| Пасля двукосся, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны: *часопіс "Бярозка" ўзнагародзіў пераможцаў; гучнае "ўра"* | |

Доўга гутарылі сяброўкі, прыводзілі прыклады слоў, дзе яны пішуцца. Час праляцеў хутка, прыйшла пара развітвацца. Сяброўкі рашылі сустракацца. А сустрэчы іх маглі адбывацца толькі тады, калі… (*Калі іх запрашалі на ўрок пры вывучэнні тэмы "Правапіс у, ў").*

*Фізкультхвілінка*

Называю вучням словы і прапаную падняцца з месца, калі ў слове ёсць выпадак напісання *У*, падняць правую руку, калі ў слове трэба напісаць *у*, падняць левую руку, калі слова пішацца з *ў:* здароўе, Уладзімір, прачытаў, соус, сяброўка, фрау, чароўны, ручка, заўважыла, жанчына-ўрач, да Уладзіславы, салаўі, настаўнік, Беларусь.

Слова настаўніка. А зараз запішыце, калі ласка, назву нашай краіны ў сшытак (Рэспубліка Беларусь). Чаму запісаныя словы пішуцца з вялікай літары? Чаму ў слове рэспубліка не пішацца ў**?** Паслухайце верш (гучыць верш), выпішыце ўсе назвы краін, з якімі мяжуе Беларусь, растлумачце правапіс *з Украінай* (Назоўнікі, якія вучні павінны запісаць: Польшча, Украіна, Расія, Латвія, Літва). А ці ведаеце вы, што ў Беларусі ёсць горад, у якім паставілі помнік літары ў?

Выступае вучань з падрыхтаваным паведамленнем і ілюструе сказанае фотаздымкамі: 7 верасня 2003 года ў Полацку быў установлены помнік літары **ў**. Ён зроблены ў выглядзе стэлы, на яе гранях размешчаны рэльефныя выявы літары. Помнік можа служыць сонечным гадзіннікам. Пры яго адкрыцці, што адбывалася падчас святкавання Дня беларускага пісьменства, гаварылася пра ўнікальнасць літары ў, сцвярджалася, што такой літары няма ў алфавітах свету, распавядалася пра непаўторную меладычнасць і мяккасць гуку, пазначанага

ёй. Менавіта гэтай літары выпаў такі лёс, за што яна і была ўшанавана помнікам удзячнымі нашчадкамі.

Загадзя падрыхтаваны вучань выразна чытае верш Анастасіі Сазанковай “У нескладовае”:

Усю ноч блукала у нескладовае,
назірала, што ў Полацку новага.
Вось тут забудова, там помнік, музей...
Месячык з неба хітравата глядзеў.
Нарэшце, на правым беразе золкім,
на хвалях Дзвіны агні, як вясёлкі.
Узірала Сафійка ў воды з гары.
Хтось прачынаўся, а хтось сніў яшчэ сны.
Шапку зняла ў знак святой Еўфрасінні,
схіліла галоўку на ножку хілую.
Ціха стаяла, нібы нежывая...
К Сымону Полацкаму завітала.
Доўга глядзела на постаць тытана
у помніка Скарыны апантана.
Заваражыў Скарына – такі волат!
А ад Дзвіны ветрык нёс свежы подых.
“Дзень добры! – сказала яна Скарыне, –
Вельмі нязручна гуляць адной мне.
Дужа прыемна, вас напаткала,
аднак, сустрэчы мне ўжо вельмі мала.
Між старых каменняў і вуліц гулкіх
я досвіткам адшукала прытулку.
Тут песняроў, друкароў сустракала,
ды лепш прапішуся ў Полацку стала”.

Слова настаўніка. Якія славутыя людзі нарадзіліся ў Полацку? (Вучні

ўзгадваюць Рагнеду, Рагвалода, Е.Полацкую, Ф Скарыну).

5 вучняў па чарзе прэзентуюць свае малюнкі, на якіх прадстаўлены славутыя палачане, і нагадваюць класу: Рагвалод – першы гістарычна вядомы полацкі князь, Рагнеда – полацкая князёўна, асветніца, дачка полацкага князя Рагвалода, жонка вялікага князя кіеўскага Уладзіміра , Е.Полацкая – манахіня і ігумення праваслаўнага манастыра, асветніца, перапісвала кнігі, стала першай жанчынай, кананізаванай Рускай праваслаўнай царквой, Ф.Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, філосаф, пісьменнік, грамадскі дзеяч, прадпрымальнік і навуковец-лекар, перакладчык і выдавец на беларускую рэдакцыю царкоўнаславянскай мовы кніг Бібліі, С.Полацкі – праваслаўны дзеяч, духоўны пісьменнік.

Слова настаўніка.

Жаўрук, сітаўка, мухалоў —
Хапае з у кароткім слоў.
Без гэтай літары адной
Завые воўк ад гора,
Дадому ластаўка вясной
Не прыляціць з-за мора.

Што хацеў сказаць аўтар сваім вершаваным творам? (*Падкрэслівае значнасць у, ў*). А як услаўляецца літара ў, якой няма ні ў адной іншай мове свету? (*У Мінску ёсць крама “Ў”, кнігарня “Ў” і галерэя сучаснага мастацтва “Ў”*)

Слова настаўніка. Зараз мы напішам слоўнікавы дыктант *“Гляджу, слухаю, пішу!”*, які складаецца з трох частак. У кожным слове абавязкова прысутнічае літара у або ў. Пастаўце лічбу “1”. Першая частка “Гляджу, слухаю, пішу!” (вучні спісваюць словы са слайда прэзентацыі)

*1. Гляджу, слухаю, пішу!*

1. Перакладзіна для адкрывання і закрывання шляху на чыгуначных пераездах, заставах. (Шлагбаум )

2. Дзікая міфічная істота з галавой і тулавам чалавека на целе каня, насельнік гор і лясных нетраў. Гэту істоту называюць паўконь, паўчалавек. (Кентаўр)

3. Старажытная кітайская парода пакаёва-дэкаратыўных сабак. Сваім знешнім выглядам сабака гэтай пароды нагадвае льва або медзведзяня. (Чау-чау)

4. Плоскі партатыўны персанальны камп'ютар з вадкакрышталічным дысплеем. (Ноўтбук)

*2. Гляджу, устаўляю літару, пішу!*

1)… нты; 2) Санта Кла..с; 3) баго…ка; 4) ла…р; 5) ліноле…м; 6)…рна.

*3. Гляджу, думаю, пішу!*

1) Страус; 2) клоўн; 3) акварыум; 4) воўк; 6) касманаўт; 7) дыназаўр.

Работа са слоўнікам. Два вучні атрымалі заданне праверыць напісанне слоў з трэцяй часткі (Гляджу, думаю, пішу) па арфаграфічнаму слоўніку.

*ІІІ. Дыягнастычна-карэкцыйны этап.*

*Гульня "Чацвёртае лішняе"* (вучыць знаходзіць агульнае і рознае, аб'ядноўваць па якой-небудзь асноўнай істотнай прыкмеце, праводзіць класіфікацыю, дапамагае замацаваць правапіс у, ў, развівае лагічнае мысленне, увагу, кемлівасць, садзейнічае развіццю пазнавальнай актыўнасці ў вучняў, творчых здольнасцей вучняў): сярод прапанаваных слоў знайдзіце лішняе.

1. Шоу, маўчыць, праўда, настаўнік.
2. Пра…дзівы, цудо…ны, …вага, кіра…нік.
3. Прачыта…, …бачыла, в…ліца, кансілі…м.
4. (па жаданні) скласці самастойна заданне па тэме ўрока.

*Гульня "Шыфравальшчыкі"* (развівае працэсы аналізу і сінтэзу, лагічнае мысленне, пазнавальную актыўнасць, арфаграфічную і пунктуацыйную зоркасць, садзейнічае ўзбагачэнню слоўнікавага запасу вучняў): расшыфруйце прыказку **(**ключ да разгадкі шукайце ў слове абвал (1, 2, 3, 1, 13)**)**, растлумачце, як вы яе разумееце і чаму ў словах пішам або не пішам у, ў**:** 25, 13, 6, 2 – 21,

12, 32, 14, 21, 4, 1, 13, 1, 3, 1. Адказ (Хлеб – **у**сяму**у** галава).

Слова настаўніка. Ці ўважліва вы, дзеці, слухалі нашых гасцей? А зараз давайце праверым, наколькі добра вы зразумелі сакрэты правапісу у, ў. Вашай увазе прапаноўваюцца сцвярджэнні, якія могуць быць правільнымі ці памылковымі. Калі вы згодны са сказаным, стаўце лічбу "1", калі не – "0".

*"Лічбавы дыктант"*

1. Літара *у* (складовае) абазначае галосны гук. *(Адказ: 1)*

2. Літара *у* (складовае) пішацца ў пачатку сказа, пасля знакаў прыпынку і пасля зычных. *(Адказ: 1)*

3. У пачатку ўласных назваў пішацца *ў* (нескладовае). *(Адказ: 0)*

4. Літара *ў* (нескладовае) не пішацца пасля галосных у пачатку слова і ў сярэдзіне слова пасля галосных перад зычнымі. *(Адказ: 0)*

5. На канцы запазычаных слоў пасля галосных ненаціскное *у* (складовае) не скарачаецца. *(Адказ: 1)*

6. Пры пераносе слова з *ў* (нескладовым) можна *ў* (нескладовае) аддзяляць ад папярэдняй літары і пераносіць на наступны радок. *(Адказ: 0)*

7. У запазычаных словах, якія заканчваюцца на *-ум*, *-ус*, і вытворных ад іх пішацца *у* (складовае). *(Адказ: 1)*

8. Літара ў (нескладовае) пішацца пасля злучка ці двукосся (якое не з'яўляецца знакам прыпынку), калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны. *(Адказ: 1)*

*Адказ: 11001011* (франтальная праверка: некалькі вучняў называюць свае адказы, а затым на слайдзе паказваецца правільны адказ)

*IV. Кантрольна-ацэначны этап.*

*V. Завяршаючы этап.*

Падвядзенне вынікаў урока.

Рэфлексія. Выкажыце сваю думку: я ведаю, што..., я ўмею..., я магу растлумачыць...

Дамашняе заданне: §18, практыкаванне 135.